родного сырья; орудия труда и приборы (устройства). Отдельную группу составляют мемориальные предметы и различные оригинальные вещественные, изобразительные и письменные источники: художественные произведения, фото-фоно-кино-видеоматериалы, 3D изображения, карты, схемы, книги, рукописи, дневники, документы, макеты, модели. Естественнонаучные эталоны в палеонтологии и минералогии имеют название «голотипы».

Среди правовых документов, регламентирующих учет музейных предметов в музеях Украины, необходимо назвать «Інструкцію з організації обліку музейних предметів», действующую с 09.09.2016 г. В Приложении 1 естественнонаучные коллекции разделены по группам хранения. В то же время изданная инструкция не отражает всей специфики музейного источниковедения естественнонаучных музеев. Необходимо принятие отдельного правового документа, регламентирующего учет и сохранность естественнонаучных музейных коллекций, подготовленного соответствующими специалистами в области естественно-исторических наук и, в частности, естесвеннонаучной музеологии.

Таким образом, успешному развитию музейного источниковедения в музеях естественнонаучного (естественно-исторического) профиля будет способствовать дальнейшее исследование вопросов унификации критериев описания различных видов коллекций. Для этого необходимо проводить периодически соответствующие конференции и семинары, что может быть осуществлено на базе Национального научно-природоведческого музея НАН Украины – координационного центра в области естественнонаучной музеологии страны. Также можно проводить такие мероприятия и на базе других музеев в регионах. Все это даст возможность выработать единые типовые образцы документации для музеев данного профиля.


1. Анфимова, Г.В. Разработка базы данных монографических палеонтологических коллекций / Г.В. Анфимова, А.А. Владимирский // Моделювання та інформаційні технології : зб. наук. пр. – Київ : ІПМЕ ім. Г. Є. Пухова НАН України, 2010. – 2010. – Вип. 56. – С. 62–65.
2. Бессуднова, З.А. Геологические исследования в Музее естественной истории Московского университета, 1759–1930 / З.А. Бессуднова. – М.: Наука, 2006. – 246 с. : ил. – (Очерки по истории геологических знаний ; вып. 32).
3. Брюшкова, Л.П. Коллекции геологических музеев как часть культурного пространства / Л.П. Брюшкова. – М. : Наука, 1993. – 96 с.
4. Кедров, Б.М. Классификация наук / Б.М. Кедров, Б.Г. Юдин // Философский словарь / под ред. И.Т. Фролова. – 7-е изд., перераб. и доп. – М. : Республика, 2001. – С. 247–248.
5. Климишин, О.С. Природнича музейна термінологія : словник-довідник / О.С. Климишин. – Львів : Державний природознавчий музей НАН УКраїни, 2003. – 244 с.
6. Климишин, О.С. Сучасні проблеми природничої музеології / О.С. Климишин // Наукові записки Державного природознавчого музею. – Львів, 2010. – Вип. 26. – С. 3–4.
7. Крахмальна, Т.В. Експонування палеоприродної спадщини четвертинного періоду / Т.В. Крахмальна, Д.В. Кепін // Праці Центру пам’яткознавства. – Київ : Центру пам’яткознавства НАН України та УТОПІК, 2010. – Вип. 17. – С. 135–150.
8. Ксенофонтова, В.В. Естественно-научные коллекции / В.В. Ксенофонтова // Российская музейная энциклопедия. – М. : Прогресс; Риппол классик, 2005. – С. 183–185.
9. Кушнаренко, Н.Н. Документоведение: учебник / Н.Н. Кушнаренко. – Киев : Об.-во «Знання», КОО, 2003. – 459 с.
10. Павлова, Н.Р. Специфика естественно-научных музейных предметов и отражение ее в составе фонда отделов природы краеведческих музеев РСФСР / Н.Р. Павлова // Музееведение : проблемы использования и сохранения музейных ценностей : сб. науч. тр.– М. : НИИ культуры, 1985. – № 136. – С. 13–22.
11. Розова, С.С. Классификационная проблема в современной науке / С.С. Розова. – Новосибирск: Изд-во «Наука» СО, 1986. – 224 с.
12. Рябчикова, Ф.Д. Природничі предмети у музеях: музеологічний аналіз правових дефініцій / Ф.Д. Рябчикова // Вісник Національного науково-природничого музею. – Київ, 2016. – Т. 14. – С. 13–22.
13. Сотникова, С.И. Естественноисторическая музеология / С.И. Сотникова. – Томск: Изд-во Томского ун-та, 2011. – 304 с.
14. Сычева, Л.С. Гносеологический анализ процессов формирования научных дисциплин: автореф. дис. …д-ра философ. наук: 09.00.01 / Л. С. Сычева / МГУ им. М. В. Ломоносова. – М., 1991. – 38 с.
15. Третяк, І.П. Огляд наукових фондових колекцій Національного науково-природничого музею НАН України / І.П. Третяк, О.В. Червоненко // Вісник Національного науково-природничого музею. – Київ, 2016. – Т. 14. – С. 115–122.
16. Шидловський, І.В. Історія музейної справи та зоологічних музеїв університетів України / І.В. Шидловський. – Львів : ЛНУ ім. Івана Франка, 2012. – 112 с.
17. Щарбатян, Т.А. О длительном хранении палеонтологических коллекций / Т.А. Щарбатян // Бюллетень Московского общества испытателей природы. Отдел геологический. – М., 1983. – Т. 58. – Вып. 2. – С. 94–101.
18. Ющенко, О.К. Пам’ятки природи / О.К. Ющенко // Українська радянська енциклопедія : у 12 т. – Київ : Наукова думка, 1977 – 1984. – Т. 8 : ОЛЕФІН – ПОПЛІН. – С. 147–148.


**Здасюк Н.М.**

## КАМПЛЕКТАВАННЕ ФОНДАЎ МУЗЕЯМІ БЕЛАРУСІ Ў 1990-я гг.

Камплектаванне фондаў з’яўляецца адным з асноўных відаў дзейнасці музея. У ходзе камплектавання музеем ажыццяўляецца функцыя накаплення сацыяльнай інфармацыі, дакументавання развіцця грамадства. Дакументаванне рэчаіснасці здзяйсняецца выбарачна і залежыць ад профіля музея, ад выдзялення сацыяльна значных фактаў, аб’ектаў рэчаіснасці для музейнага вылучэння з мэтай камплектавання фондаў, ад адбору прадметаў рэальнага свету ў якасці музейных крыніц. На

Репозиторий БГУ

адбор істотна ўплывае музейны падыход да рэчаіснасці, абумоўлены роллю музея быць прадметна замацаванай памяццю грамадства. Разам з тым, на выбары музейна значных фактаў заўседы ляжыць пячатка пэўнага часу, яго грамадскіх ідэй, уяўленняў аб каштоўнасцях культуры.

Музеі Беларусі да пачатку 1990-х гадоў напрамую залежылі ад музейнай палітыкі, якую праводзіла дзяржава. Для яе былі характэрны адміністрацыйныя меры ўздзеяння, строгая рэгламентацыя дзейнасці музея, перакос у бок культурна-асветніцкай дзейнасці за кошт навукова-даследчай і захавальніцкай. Асноўнай мэтай музеяў была прапаганда дасягненняў сацыялістычнага ладу. На дасягненне гэтай мэты былі накіраваны ўсе віды музейнай дзейнасці, і ў першую чаргу – камплектаванне фондаў.

У савецкіх музеях існавала адзіная сістэма падбору музейных прадметаў. Яна жорстка рэгламентавалася зверху ў пяцігадовых планах навукова-даследчай работы музеяў. Перад музеямі рэспублікі ставілась задача камплектавання фондаў помнікамі гісторыі і культуры беларускага народа, асабліва па гісторыі савецкага грамадства. І ўвогуле падкрэслівалась, што прыярытэт пры зборы музейных прадметаў павінен аддавацца матэрыялам сучаснасці [8]. Вынікам такой палітыкі стала тое, што сярод новых паступленняў у музейныя фонды матэрыялы па перыяду развітога сацыялізму складалі больш за 60% [1, арк. 44], а ў раённых музеях гэтая лічба ўзнімаелася да 90% [1, спр. 1855, 1911].

Першыя спробы змяніць падыход да камплектавання музейных фондаў адбыўся ў часы перабудовы. Аднак новыя прапановы Міністэрста культуры БССР хоць і адрозніваліся ад папярэдніх адсутнасцю жорсткіх установак на ідэалагізацыю, але галоўны прынцып камлектавання фондаў савецкіх музеяў – прыярытэт у зборы матэрыялаў сучаснасці ўсімі музеямі – захаваўся [1, спр. 1955, арк. 13]. У гэты ж перыяд пачынаецца распрацоўка Навуковай канцэпцыі развіцця і ўдасканалення музейнай справы ў рэспубліцы. Штуршком да гэтага стала ўсведамленне крызіснага становішча айчынных музеў. У якасці асноўнай праблемы музейнай справы рэспублікі вызначалі, у першую чаргу, незбалансаванасць тэматыкі музейнай сеткі. З 82 музеяў сістэмы Міністэрства культуры 46 складалі краязнаўчыя музеі, 5 – агульнагістарычных, 1 – гісторыка-рэвалюцыйны, 4 – ваенна-гістарычных, 10 – народнай славы, 6 – літаратурных, 4 – гісторыка-мемарыяльных, 1 – народнай творчасці, 1 – гісторыі атэізму і рэлігіі, 1 – народнага мастацтва, 1 – народнай архітэктуры і побыту, 2 – мастацкіх [1, спр. 1954, арк. 2]. Падкрэсліваўся недахоп музеяў этнаграфічных, археалагічных, музычных, мемарыяльных, літаратурных, таэтральных, мастацкіх, якія павінны складацца на аснове арыгінальных калекцый.

Адным з шляхоў вырашэння вызначанай праблемы спецыялісты-музейшчыкі бачылі ў змяненні падыходаў да камплектавання музейных фондаў. Вельмі агульны характар планаў камплектавання, без уліку спецыфікі і профіля канкрэтнага музея, негатыўна адбіўся на складзе музейных збораў. Адсутнасць навукова абаснаванага мэтанакіраванага плана прыводзіла не да фарміравання поўнай музейнай калекцыі, а да засмечвання і распылення навуковай значнасці музейнага матэрыяла. Таму вядучым музеям рэспублікі і аддзелу музеязнаўства Міністэрства культуры БССР было даручана ў 1990–1991 гадах распрацаваць навукова абгрунтаваныя крытэрыі адбору музейных матэрыялаў па якаснаму паляпшэнню стану фондавых калекцый для ўсіх музеяў адпаведнай тэматычнай накіраванасці [1, спр. 1954, арк. 6].

Адной з найважнейшых праблем камплектавання музейных фондаў на пачатак 1990-х гг. быў якасны ўзровень збіраемага матэрыялу. Прыярытэт колькасных паказчыкаў, характэрны для ўсіх сфер савецкага грамадства, не абмінуў і музейную справу. Імкненне ў кароткія тэрміны папоўніць свае калекцыі не лепшым адбівалася на іх якасці і ўзроўню апісання. Прынцып усебаковасці і комплекснасці, пакладзены ў аснову камплектавання ў савецкім музеязнаўстве, часта трактаваўся як неабходнасць збору ўсёй разнастайнасці матэрыялаў, адлюстроўваючых вывучаемую праблему [2, с. 17]. У камплектуемых зборах значнае месца займаў дакументальны і фотаматэрыял, рэчывыя ж помнікі складалі невялікі працэнт. Асабліва вострa гэтая праблема стаяла перад раённымі краязнаўчымі музеямі рэспублікі. На калегіі ўпраўлення культуры Маглёўскага абліспалкома адзначалася, што “... гістарычнымі даследваннямі раёну ды і вобласці на працягу апошніх 10 гадоў амаль ніхто не займаўся, таму скраліcь такія абставіны, калі мясцовая гісторыя страціла свае індывідуальныя, яркія рысы. ... У музеях ў асноўным назапашаны больш ці менш этнаграфічныя рэчы і матэрыялы савецкага часу” [7].

Для пераадолення азначаных праблем і канцэнтрацыі ў фондах сапраўды навуковых калекцый прапаноўвалася найперш правесці якасную ацэнку стану фондавых калекцый кожнага музея. У якасці яе крытэрыяў вызначаліся наступныя: удасканаленне каштоўнасці кожнай рэчы для больш

дакладнага аднясення яе да асноўнага фонда; удакладненне складу існуючых калекцый і вызначэнне сярод іх традыцыйна склаўшыхся; даць адзнаку якасці кожнай калекцыі [4]. Дадзеныя мерапрыемствы былі накіраваны на пераадоленне таго факта, што часта самі музейшчыкі не ведалі, якімі зборамі валодае музей і ў якім стане яны знаходзяцца. Атрыманыя вынікі адзнакі стану фондавых калекцый былі пакладзены ў аснову складаемых у музеях у гэты ж перыяд комплексных праграм каплектавання музейных фондаў. Галоўны прынцып, які быў пакладзены ў аснову праграм камплектавання большасці музеяў, гэта пакалекцыйны збор прадметаў.

Значнай з'явай у беларускіх музеях, якая паўплывала ў тым ліку і на ўзровень камплектавання музейных калекцый, стала прапанова Міністэрства культуры у музеям змяніць арганізацыйную структуру. Дзеля гэтага прапаноўвалася правесці наступныя змены: а) ліквідаваць аддзелы экспазіцыйнай работы і перавесці яго супрацоўнікаў у навукова-фондавы аддзел, тым самым узмацніў навуковую вартасць азначанага аддзела; б) вызначыць у структуры навукова-фондавых аддзелаў супрацоўнікаў, якія павінны ўзначаліць творчыя калектывы, адказныя за калекцыі; в) галоўны захавальнік фондаў павінен адначасова з'яўляцца намеснікам дырэктара [5]. Пры гэтым прадугледжвалась, што большая частка калектыва музея будзе занята вывучэннем фондавых калекцый. Паміж супрацоўнікамі аддзела фондаў былі размеркаваны і замацаваны пад матэрыяльную адказнасць калекцыі музейных прадметаў [9]. Прапанову Міністэрства музеі падтрымалі і на працягу рязглядаемага перыяду адбылася перадача калекцый у Нацыянальным гістарычным музее Рэспублікі Беларусь, Дзяржмузее гісторыі Вялікай айчыннай вайны, Магілёўскім і Віцебскім абласных краязнаўчых музеях і інш.

Працэс перадачы калекцый запаволіў тэмпы камплектавання фондаў. Навуковым супрацоўнікам трэба было спачатку ацэніць якасць і паўнату атрыманай калекцыі, а потым распрацаваць план яе камплектавання. Аднак ужо с пачатку новая ініцыятыва прынесла чаканую карысць: у справаздачах музеяў адзначаецца, што"...зараз ужо камплектаванне вядзецца не стыхійна, а з улікам стану калекцый..." [3].

Адной з тэндэнцый у камплектаванні музейных збораў азначанага перыяда было рэзкае скарачэнне на пачатку 1990-х гадоў колькасці збіраемых матэрыялаў. Прычын таму было шмат. Гэта і невысокія фінансавыя магчымасці музеяў, з-за якіх скарацілася колькасць экспедыцый; і адсутнасць жорсткіх патрабаванняў на павялічэнне год ад году колькасці збіраемых матэрыялаў; і тое, што ў гэтыя час толькі пачалася праца па распрацоўцы навуковых канцэпцый развіцця ўсіх напрамкаў дзейнасці музеяў, у тым ліку і перспектыўных планаў камплектавання фондаў, што таксама запаволіла тэмпы збору музейных прадметаў. У той жа час адзначаецца, што ў сярэдзіне 1990-х гадоў у параўнанні з паказчыкамі сярэдзіны 1980-х негледзячы на скарачэнне паступленняў у фондавыя калекцыі, іх якасць паднялася на значна вышэйшы ўзровень.

У канцы 1990-х гадоў тэмпы прыросту музейных фондаў складалі 3,2% [6, с. 57], найбольш актыўна працэс камплектавання вёўся ў музеях Віцебскай вобласці (5,3%), што тлумачыцца найбольш развітой сеткай музеяў у гэтым рэгіёне. Па колькасці прадметаў асноўнага фонду на канец 1990-х гадоў, самую вялікую групу складалі калекцыі археалагічных матэрыялаў (19%), затым ідуць нумізматычныя калекцыі (16%), фотаматэрыялы (13%), дакументальныя крыніцы (12%), друкаваныя выданні (12%) [6, с. 58]. У перыяд з 1985 па 2000 г. колькасць прадметаў музейнага фонду павялічылася з 1 470 000 да 2 446 751 адзінак (66,4%).

Адметнай рысай у камплектаванні музейных збораў у 1992–2000 гг. было імкненне да яго сапраўды навуковага абгрунтавання. На аснове зробленай адзнакі стану музейных калекцый і профіля музея, кожны музей самастойна вызначаў, якія прадметы павінны папоўніць збор. Асноўным прынцыпам папаўнення музейных фондаў у адзначаны перыяд быў пакалекцыйны збор прадметаў, у адрозненне ад тэматычнага, які пераважаў у папярэднія гады.

1. Архіў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – Ф. 974, Воп. 1. Спр. 1858.
2. Бычкова, Ю. А. Некоторые проблемы комплектования фондов в музеях исторического профиля / Ю. А. Бычкова // Музей и современность: сб. науч. трудов. – № 114. – М., 1982. – С. 8–19.
3. Витебский областной краеведческий музей. Текущий архив. Отчет о работе музея за 1996 г.
4. Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей. Бягучы архіў. Прыкладны варыянт падыходу да адзнакі якасці фондавых калекцый. 1993 г.
5. Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай айчыннай вайны. Бягучы архіў. Прапановы па змяненню арганізацыйнай структуры музеяў. 1992 г.
6. Культурнае жыццё рэспублікі: стан, праблемы, перспектывы. – Мінск, БІПК, 1999. – С. 56–80.
7. Магілёўскі абласны краязнаўчы музей. Бягучы архіў. Вынікі працы краязнаўчых музеяў вобласці за 1992 г. і накірункі дзейнасці на 1993 г.
8. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Бягучы архіў Перспектыўны план каардынацыі навукова-даследчай работы музеяў БССР на 1986–1990 гг.
9. Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. Бягучы архіў. Загад па музею № 81 ад 23.12.1992 г.



Репозиторий ВГУ